Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ А.І.Жук
«___» _____________2011 г.
Рэгістрацыйны №, ТД- ___ / тып.

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗЫЦЫІ ФАЛЬКЛОРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: ГУЛЬНЁВЫ ФАЛЬКЛОР
## (Раздзел 1)

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных установ**
**Спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**Напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела
навучальных устаноў
і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________А.У.Рыбчынская
«___»__________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У.Святлоў
«___» ___________2011 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю.І.Міксюк
«___» ___________2011 г.

Рэктар дзяржаўнай
установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
____________ В.І.Шупляк
«___» ___________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр
_____________________
«___» ___________2011 г.

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Т.А. Мельнікава, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Т.В. Валодзіна, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ІМЭФ НАН Беларусі, доктар філалагічных навук

І.М. Грамовіч, дацэнт кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНАДАЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад «30» жніўня 2011 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № ад г.);

Адказны за выпуск А.А. Гулак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На сучасным этапе развіцця соцыума масавая культура аказвае значны ўплыў на свядомасць маладога пакалення і тым самым імкнецца адцясніць на другі план шматвяковую традыцыйную духоўную культуру беларусаў. Ва ўмовах, калі амаль на нашых вачах даволі хутка звужаецца сфера яе актыўнага бытавання, значна змяншаецца кола людзей-носьбітаў народнай традыцыі, праблема захавання і вывучэння фальклору становіцца надзвычай актуальнай. Пашырэнне поля практычнага ўжывання разнастайных відаў фальклору прывяло да імклівага развіцця прыкладных дысцыплін і павышэння эфектыўнасці выкарыстання іх вынікаў у грамадска-культурным жыцці краіны. Вырашальнае значэнне сёння набывае перадача ведаў па аўтэнтычным ўвасабленні гульнявых формаў беларускага фальклору сучаснаму маладому пакаленню, як важны і абавязковы элемент яго побыту, правядзення вольнага часу і прафесійнай дзейнасці.

Курс “Гульнёвы фальклор” разлічаны для студэнтаў I года навучання спецыяльнасці “народная творчасць” спецыялізацыі “фальклор” і “этнафоназнаўства”. Ён з'яўляецца складовай часткай курсу «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» і лагічным працягам курсаў "Беларускі фальклор" і “Фальклорны практыкум”. Курс мае тэарэтычную і практычную скіраванасць. Яго тэарэтычны раздзел скіраваны на засваенне студэнтамі фундаментальных паняццяў гульнявога фальклору, на азнаямленне з гісторыяй даследавання народных гульняў і асноўнымі сістэмамі іх класіфікацыі, на вызначэнне месца і ролі гульняў у беларускім фальклоры. Значная частка яго прысвечана падрабязнаму аналізу каляндарных, сямейна-абрадавых і абрадава непрымеркаваных гульняў і ігрышчаў беларусаў, складанню гульнявой картатэкі, тэхналогіі распроцоўцы сцэнараў абрадавых гульнявых дзянняў. Практычны раздзел курсу нацэлены на набыццё навыкаў арганізацыі і правядзення беларускіх народных гульняў і гульнявых праграм.

“Гульнёвы фальклор” рыхтуе фальклnetwork-прафесіяналаў да асобаснай арыентацыі у сучасным свеце, да рэалізацыі творчых запатрабаванняў, накіроўвае іх на захаванне і працяг нацыянальных культурных традыцый, што патрабуе высокай ступені кампетэнтнасці і наяўнасць глыбокіх ведаў у сферы фальклору і яго гульнявых формаў.

Мэта курса – засваенне асноў гульнявога фальклору беларусаў. Ён нацэлены на:

- аваладанне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанных з вывучэннем месца і ролі народных гульняў і ігрышчаў абрадавай і пазаабрадавай практыцы беларусаў;
- усведамленне непаўторнасці, унікальнасці, шматстатнасці і варыятыўнасці розных народных гульняў праз выяўленне іх сутнасці і асаблівасцяў ужывання;
- выпрацоўку практычных навыкаў арганізацыі і правядзення гульнёвых праграмм і здольнасці да іх адэкватнай інтэрпрэтацыі на сучасным этапе;
- развіццё актыўнага творчага мыслення і самастойнасці меркаванняў, фармаванне аналітычнай кампетэнцыі (разуменне спецыфікі і значнасці).

Падчас засваення курсу **студэнт павінен ведаць**:

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгляданыя ў рамках дадзенай дысцыпліны;
- сістэмы класіфікацыі беларускіх народных гульняў і ігрышчаў;
- жанравы склад гульнявых форм фальклору;
- гісторыю і асноўныя этапы даследавання гульняў і ігрышчаў беларусаў;
- змест найболей тыповых беларускіх каляндарных і сямейна-родавых народных гульняў і арэал іх бытавання.

**умець:**

- самастойна аналізаваць і сістэматызаваць беларускія народныя гульні і ігрышчы;
- складаць гульнявую картатэку;
- распрацоўваць сцэнары беларускіх абрадавых гульнявых дзеянняў;
- арганізаваць і правесці народную гульню і гульнявую праграму.

Дыягностыка дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна, уключаючы апытанне на практычных і індывідуальных занятках па пэўных раздзелах дысцыпліны і выніковы кантроль у форме іспыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усяго гадзін па дысцыпліне– 96, з іх усяго аўдыторных – 44 (лекцыйных – 12, практычных заняткаў – 22, індывідуальных – 10).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лек. | Пр. зан | Інд. зан |
| 1. | **Уводзіны** | 2 | 2 | | |
| 2. | Тэма 1. Гульнёвы фальклор як від беларускага фальклора ў кантэксте сучаснай культуры і адукацыйная дысцыпліна | 2 | | 2 | |
| 3. | **Раздзел 1. Тэарэтычныя падставы гульнявога фальклору як інтэграванай вобласці ведаў** | | | | |
| 4. | Тэма 2. Уводзіны ў асновы тэорыі гульні. Гісторыя збірання і даследавання беларускіх народных гульняў | 2 | 2 | | |
| 5. | Тэма 3. Класіфікацыя беларускіх народных гульняў. Сэнсава-семантычнае напаўненне знака, сімвала, тэкставых рытма-формулаў у гульнявым фальклоры | 2 | | 2 | |
| 6. | Тэма 4. Гісторыка-этнаграфічныя і геаграфічныя падставы гульнявога фальклору. Тэарэтычныя перадумовы даследавання гульняў | 4 | 2 | 2 | |
| 7. | **Раздзел 2. Агульная характарыстыка каляндарных і семейна-родавых гульняў беларусаў** | | | | |
| 8. | Тэма 5. Беларускія народныя гульні і ігрышчы зімовага і вясновага, летняга і восеньскага цыклаў | 4 | 2 | 2 | |
| 9. | Тэма 6. Вясельныя і хрэсьбінныя гульні і ігрышчы беларусаў | 4 | 2 | 2 | |
| 10. | **Раздзел 3. Пазаабрадавыя гульні і ігрышчы беларусаў** | | | | |
| 11. | Тэма 7. Беларускія народныя гульні з інвентаром, без інвентара, з выпадковымі спадручнымі прадметамі | 2 | | 2 | |
| 12. | Тэма 8. Гульнявыя формы дзіцячага фальклору | 2 | | 2 | |
| 13. | Тэма 9. Народныя забавы беларускага кірмашу | 2 | | 2 | |
| 14. | **Раздзел 4. Тэхналогія арганізацыі і правядзення беларускіх народных гульняў і гульнявых праграм** | | | | |
| 15. | Тэма 10. Методыка даследавання беларускіх народных гульняў | 4 | 2 | 2 | |
| 16. | Тэма 11. Складанне гульнявой картатэкі. Роля і прафесійныя якасці вядучага, як арганізатара гульні | 8 | | 2 | 6 |
| 17. | Тэма 12. Тэхналогія распрацоўкі сцэнарыяў абрадавых гульнявых дзеянняў. Пастаноўка і правядзенне народных гульняў і гульнявых праграм | 6 | | 2 | 4 |
| | **Разам…** | **44** | **12** | **22** | **10** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны. Месца гульнёвага фальклору ў фарміраванні этнічнай культуры. Сувязь тэорыі гульні з іншымі адгалінаваннямі этнаграфіі і практычнай фалькларыстыкі. Гульня як культурны феномен, які функцыянуе ў побыце, узаемаадносінах, паводзінах, менталітэце чалавечых супольнасцей. Асноўныя паняцці: народ, этнас, гульнёвы фальклор.

### Тэма 1. Гульнёвы фальклор як від беларускага фальклора ў кантэксце сучаснай культуры і адукацыйная дысцыпліна

Гульнёвы фальклор беларусаў як цэласны і структурна складаны, неаднародны па генетычных вытоках, унутранай прыродзе і грамадскім прызначэнні феномен народнай традыцыйнай спадчыны. Азначэнне паняцця "гульнёвы фальклор". Гульёвы фальклор у сістэме навуковага ведання і адукацыйных дысцыплін. Задачы курсу, структура і яго роля ў сістэме падрыхтоўкі адмыслоўца-фалькларыста.

Праблемы навуковага даследавання гульнёвага фальклору ў Беларусі і за мяжой.

Трансфармацыя гульнёвых формаў фальклору ў сучаснай сітуацыі. Новае асэнсаванне сутнасці і значнасці народных гульняў ў грамадска-культурным жыцці краіны.

### Раздзел 1. Тэарэтычныя падставы гульнявога фальклору як інтэграванай вобласці ведаў

### Тэма 2. Уводзіны ў асновы тэорыі гульні. Гісторыя збірання і даследавання беларускіх народных гульняў

Своеасаблівасць і шматварыянтнасць гульнявых форм беларускага фальклора. Разнастайнасць азначэнняў паняцця "гульня". Гульня як драматызаванае дзеянне. Структура, мэта, асноўныя функцыі і асаблівасці існавання гульні. Тэматычнае багацце гульняў. Дэфініцыя назваў народных твораў. Суадносіны паняццяў "народныя гульні" і "народныя ігрышчы". Размежаванне жанраў "вячэрнія ігрышчы" і "вячоркі". Роля "паганскіх" гульняў" у беларускім фальклоры (паводле А.Лозкі). "Забавы" як жанр гульнявога фальклору с перавагай славесных формулаў і іх разнавіднасці "забаўлянкі" і "пацешкі".

Гісторыя збірання і даследавання народных гульняў. Зараджэнне навуковых ведаў аб гульнёвым фальклоры пачынаючы з XI ст. Разнаскіраванасць спецыяальных даследчых работ ў XIX – XX ст. пад уплывам ідэй рамантызму этнаграфіі і фалькларыстыкі, скіраваных на вывучэнне традыцыйнай гаспадарчай і культурнай дзейнасці, звычаяў і абрадаў. Шматграннасць навуковай дзейнвсці Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, П. Шэйна на мяжы XIX – XX стст.: экспедыцыйнае збіранне і вывучэнне, дэталізаванае апісанне у непарыўнай сувязі з іншымі відамі народнай творчасці.

### Тэма 3. Класіфікацыя беларускіх народных гульняў. Сэнсава-семантычнае напаўненне знака, сімвала, тэкставых рытма-формулаў у гульнявым фальклоры

Праблемы класіфікацыі народных гульняў і ігрышч. Размеркаванне беларускіх народных гульняў па асноўным прынцыпам: функцыянальна-тэматычнаму і каляндарнаму: каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні і гульні, не звязаныя з календаром і абрадамі (па А.Лозка); ўзроставаму: для дашкольнага, малодшага школьнага, сярэдняга і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старэйшага школьнага ўзросту (М. Нікіфароўскі, Я.Вількін і інш); па "пераважнаму ўздеянню": інтэлектуальныя і фізічныя (Е. Раманаў, Г. Барташэвіч); па прыкметам арганізацыі ўдзельнікаў гульні; па сезонных прыкметах; па прыкметах пераважнага месца правяддзення і інш.

Шматстатнасць тыпаў беларускіх народных гульняў: спартыўныя гульні (гульні, якія уключаюць элементы фізічнай або разумовай трэніроўкі); драматычныя (гульні, якія згрупаваны па прыкметах сюжэтнага характару, маюць наяўнасць мастацкага вораза і драматычнай дзеі); арнаментальныя (гульні, якія ўключаюць харэаграфічныя ці танцэвальныя элементы); творчыя. Разнастайнасць відаў народных гульняў і ігрышч: гульні з гульнёвым інвентаром, гульні без інвентара або з выпадковымі спадручнымі прадметамі і інш.

Семантыка знака, сімвала (яйка, вянок, персцёнак і г.д), арнаментальных кампазіцый тэкставых рытма-формулаў у гульнёвым фальклоры.

## Тэма 4. Гісторыка-этнаграфічныя і геаграфічныя падставы гульнявога фальклору. Тэарэтычныя перадумовы даследавання гульняў

Гісторыка-этнаграфічныя і геаграфічныя асаблівасці гульнёвага фальклору (з улікам мясцовай мовы, ў сувязі з працоўнай дзейнасцю і г.д).

Агульнанацыянальныя, рэгіянальныя, тэрыторыяльныя і лакальныя асаблівасці беларускіх народных гульняў і ігрышч. Асаблівасці умоў існавання і функцыянавання. Тэрыторыя распаўсюджання асноўных абрадаў і гульняў беларусаў.

Тэарэтычныя перадумовы збірання і даследавання беларускіх народных гульняў і ігрышч (асноўныя праблемы вывучэння, пашпартызацыі, сістэматызацыі, класіфікацыі і параўнальнага аналіза беларускіх народных гульняў і ігрышч).

## Раздзел 2. Агульная характарыстыка каляндарных і сямейна-родавых гульняў і ігрышчаў беларусаў

## Тэма 5. Беларускія народныя гульні і ігрышчы зімовага і вясновага, летняга і восеньскага цыклаў

Каляндарныя і сямейна-родавыя гульні як найбольш кансерватыўны і архаічны пласт народный спадчыны.

Міфалагічны і сюжэтна-тэматычны аспекты каляндарных гульняў. Змена функцыянальнай накіраванасці абрадаў на гульнявыя дзействы. Сутнасць і мэтанакіраванасць беларускіх каляндарных народных гульняў і ігрышчаў. Арэал распаўсюджання і тэрытарыяльная спецыфіка гульняў. Традыцыя пераапранання ў жывёл, птушак, розных міфалагічных персанажаў і інш. Варыянтнасць тэкстаў, танцаў і мелодыкі песень.

Агульная характарыстыка, змест і сцэнар беларускіх каляндарных гульняў зімовага і веснавога перыяду ("Каляды", "На куццю", "Гуканне вясны" і інш).

Агульная характарыстыка, змест і сцэнар беларускіх каляндарных гульняў летняга і восеньскага перыяду ("Купалле", "Духаў дзень", "Зялёныя святкі", "Сёмуха-Тройца", "Зажынкі і Дажынкі", "Завіванне барады" і інш).

## Тэма 6. Вясельныя і хрэсьбінныя гульні і ігрышчы беларусаў

Сюжэтна-тэматычны змест і асноўная характарыстыка беларускіх сямейна-абрадавых гульняў і ігрышч. Разнастайнасць правядзення абрадавых і гульнявых дзеянняў на вяселле і хрэсьбіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сцэнар, асаблівасці правядзення і пастаноўкі беларускіх вясельных гульняў і ігрышч (“Сваты”, “Выкуп маладой”, “Выкраданне нявесты”, “Выкуп касы”, “Дарэнне маладых” і інш). Вызначальная роля і характар дзейнасці вядучага на вяселлі.

Сцэнар, асаблівасці правядзення і пастаноўка беларускіх хрэсьбінных гульняў і ігрышч (“Бабіна каша”, “Валаканне бабкі”, “Даведкі” і інш) гульні і ігрышчы.

## Раздзел 3. Асноўныя прынцыпы арганізацыі пазаабрадавых гульняў і ігрышчаў беларусаў

### Тэма 7. Беларускія народныя гульні з інвентаром, з выпадковымі спадручнымі прадметамі, без інвентара

Разнастайнасць пазаабрадавых гульняў беларусаў, якія не звязаныя з календаром і абрадамі ці страцілі сваю каляндарную і абрадавую прымеркаванасць (паводле А.Лозкі) (карагодная гульня “Яшчар” і інш). Прынцыпы класіфікацыі абрадава непрымеркаваных гульняў і ігрышчаў беларусаў. Іх змест і асаблівасці правядзення.

Агульная характарыстыка беларускіх народных гульняў з інвентаром (палкамі, мячом і другімі рознымі прадметамі).

Агульная характарыстыка беларускіх народных гульняў без інвентара або з выпадковымі спадручнымі прадметамі (з бегам навыперадкі, звязаныя з лоўляю, пошукам; з элементамі барацьбы і іншымі сілавымі прыёмамі; з дзеяннямі, якія патрабуюць нагляднасці, кемлівасці; з перавагаю элементаў інтермедыі, харэаграфіі, імітацыі; з творчай выдумкай і інш).

### Тэма 8. Гульнявыя формы дзіцячага фальклору

Асноўныя сістэмы класіфікацыі дзіцячых беларускіх народных гульняў і ігрышчаў. Размеркаванне гульняў па пераважнаму віду гульнёвай дзейнасці з улікам ўзроставых асаблівасцей (Я. Вількін). Змест, сэнс і асноўная характарыстыка дзіцычых гульняў.

Класіфікацыя дзіцячых гульняў па сістэме Я. Вількіна (“усе з усімі”; “сам за сябе”, “каманда за каманду”). Спосабы вылучэння вядучага і падзела гульцоў на каманды.

Агульная характарыстыка дзіцячых гульняў: рухомых (“Чахарда”, “Пятнашкі”, “Жмуркі” і інш); разумовых або творчых (“Зязюля”, “Прарок” і інш); сімвалічных (у жывёл і птушак “Кошка”, “Мышка” і інш., у “Салдаты”, “Разбойнікі” і інш).

Асобая група дзіцячых рухавых гульняў – скаўцкія гульні і забавы. Мэта і роля скаўтскіх праграм ў выхаванні падлеткаў (У. Казлоўшчык).

### Тэма 9. Народныя забавы беларускага кірмашу

Шматстатнасць формаў народных забаў і гульняў беларускага кірмашу. Спецыфіка і тэматыка народных забаў і пацех беларускага кірмашу. Роля і функцыі забаў і пацех у выхаванні дзяцей.

Агульная характарыстыка забаў, патрабуючых фізічных сіл, спрыту (стралянне і паляванне, конная язда, кулянне, ходы на хадулях, каток і інш).

Агульная характарыстыка забаў з элементамі інтеррмедыі і імітацыі (вызыванне і заклінанне дажджу, “Зязюля”, “Баба” і інш).

## Раздзел 3. Тэхналогія арганізацыі і правядзення беларускіх народных гульняў і гульнявых праграм

### Тэма 10. Методыка даследавання беларускіх народных гульняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульнанавуковыя даследчыя метады (тэарэтычны і эмпірычны). Спецыфіка даследавання беларускіх народных гульняў і ігрышч (складанне плана і спісу пытанняў, накіраванасць пошука (тэматычная, тэрытарыяльная і г.д), апытанне, вывучэнне, адбор і аналіз інфармацыі з улікам лакальных асаблівасцяў (мовы, геаграфічнага становішча і г.д), пашпартызацыя, сістэматызацыя, складанне каталога). Аналітычная работа з першакрыніцамі і навукова-даследчай літаратурай (вылучэнне асноўных напрамкаў даследавання, падрабязны крытычны аналіз, тэзіснае канспектаванне).

Асноўныя прынцыпы і прыёмы арганізацыі народных гульняў і ігрышчаў беларусаў.

**Тэма 11. Складанне гульнявой картатэкі.**
**Роля і прафесійныя якасці вядучага, як арганізатара гульні**

Структура гульнёвых картак: назва гульні, яе прымеркаванасць, мэта ўжывання, аудыторыя, месца і час правядзення, асаблівасці пабудовы, апісанне гульні, правілы і метадычныя ўказанні. Методыка складання гульнёвай картатэкі (сістэматызацыя гульняў па тэматыке, па прымеркаванасці да абрадаў (каляндарных, семейна-родавых) чы наадварот, па непрымеркаванасці да абрадаў (па сезанных прыкметах і інш).

Значэнне і роля вядучага, як арганізатара (“ўрадніка”) гульні. Функцыі “ўрадніка”: выхаваўчая, адукацыйная, камунікатыўная, сацыяльна-грамадская і інш. Прафесійныя і арганізатарскія якасці вядучага гульні: арганізацыя збору і традспарціроўкі інвентара, мастацкае і гаспадарчае афармленне месца дзеяння, збор удзельнікаў свята і г.д.

**Тэма 12. Тэхналогія распрацоўкі сцэнарыяў абрадавых гульнявых дзеянняў.**
**Пастаноўка і правядзенне народных гульняў і гульнявых праграм**

Тэхналогія распрацоўкі сцэнараў гульнёвых праграм (падбор матэрыяла, складанне плана свята з разлік часу правядзення, схематычная пабудова месца дзеяння і г.д). Канструктыўныя асаблівасці сцэнараў (усталёйка дэкарацый, мастацкае афармленне месца дзеяння і інш). Структура і кампазіцыйная пабудова гульнёвага дзеяння: падрыхтоўчы этап сцэнара гульнявога дзеяння (тэматычны збор і аналіз матэрыяла, складанне спіса ўдзельнікаў, падбор інвертара ці іншых спадручных прадметаў, пошук пляцоўкі і г.д); экспазіцыйная частка (уводзіны ўдзельнікаў ў дзею, абмеркаванне сцэнарыя, размеркаванне роляў і інш), завязка дзеяння, кульмінацыя (развіццё дзеі), развязка, фінальная частка дзеяння (збор удзельнікаў, арганізацыя традспартыроўкі інвентара і г.д). Праблемы правядзення гульнёвых праграм (арганізацыя піратэхнічных эффектаў, ілюмінацыі, феерверкаў, вогнішчаў і г.д).

Інтэрпрэтацыя народных гульняў на сучасным этапе (з улікам ужывання папулярнай музыкі, сучаснага гульнявога інвентара і інш).

Пастаноўка гульнёвых праграм к абрадавым дзеянням: “Калядаванне і Шчадраванне” і “Купальскае ігрышча”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


***Асноўная***

1. Беларускія народныя гульні і забавы / Уклад. К.Л. Лабчэўская. - Мінск: Беларусь. 1996. – 31 с.
2. Гульні, забавы, ігрышчы / Уступ. арт., уклад. А.Ю. Лозка. - Мінск: Беларуская навука, 2003. – 534 с.
3. Игра*:* мыслители прошлого и настоящего о ее природе и педагогическом потенциале: хрестоматия / Уч. пос. – Сост. Е.А. Репринцева. - Москва: Издательство МПСИ, 2006. – 599 с.
4. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2-х Т. - Мінск: Беларуская энпыклапедыя. Т. 1. – Мінск: БелЭн., 2005. – 768 с., Т. 2. – БелЭн.. 2006. – 832 с.
5. Лозка, А. Беларуская Батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні: Дапаможнік для настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў гурткоў / А. Лозка. - Мінск: Тэхналогія, 1997. – 182 с.
6. Аляхновіч, А.М. Беларускі дзіцячы фальклор / А.М. Аляхновіч, М.В. Рахчэўскі. – Мінск: Народная асвета. 1994. – 270 с.
7. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. - Мінск: Народная асвета. 1993. – 120 с.
8. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падручнік для філ. факультэтаў ВНУ / Сост. К.П Кабашнікаў і інпі. – Мінск, 1988.
9. Беларускі дзіцячы фальклор. Традыцыйныя запісы, апрацоўкі і аўтарскія творы / Склад. А.М. Аляхновіч, М.В. Рахчэеў, А.С. Фядосік, У.Д. Каструлёў. – Мінск: Беларусь, 1994. – С.123-267.
10. Беларускі фальклор: Жанры, віды, Паэтыка: у 6-х Т. - Мінск: Беларуская навука, 2001 – 2002. –Т.6.

***Дадатковая***

11. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / Склад. К.П. Кабашнік, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка. - Мінск: Вышэйшая школа. 1985. - 749 с.
12. Беларусы / Вусная паэтычная творчасць / Склад. Г. А. Барташэвіч, Т.В. Валодзіна. А.І. Гурскі і інш. - Мінск: Беларуская навука. 2004. – Т. 7. – 586 с.
13. Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні / Уклад. В.С. Семенякоў. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С.3–125.
14. Васілевіч. У. А. Беларускі народны каляндар / У.А. Васілевіч. - Мінск: Ураджай. 1993. – 80 с.
15. Вількін, Я.Р. Беларускія народныя гульні / Я.Р. Вількін. – Мінск: Беларусь. 1996. - 86с.
16. Вількін, Я.Р. Беларускія народныя гульні: зборнік дзіцячых гульняў / Я.Р. Вількін. – Мінск: Народная асвета, 1969. – 112 с.
17. Грымаць, А.А. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць. Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч. - Мінск: Ул.М.Скакун, 1999. – 256 с.
18. Гуд П.А. Беларускае купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П.А. Гуд. – Мінск: БДУ культуры, 1999. – С.56-136.
19. Гуд П.А. Гуд Н.І. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд – Мінск: Полымя, 1996. – С.19-98.
20. Гуд П.А. Святы, якія заўжды з намі: Гульнявыя праграмы “Ад Каляд да Пакроваў” / П.А. Гуд – Мінск: Красіка-Прынт, 1999. – 210 с.
21. Дзіцячы фальклор / Рэд. В.К. Бандарчык і інш. - Мінск: Навука і тэхніка. 1972. – 736с.
22. Дзіцячыя фальклорныя гульні / Уклад. З.Л. Леановіч, Н.А. Рылькова. - Мінск: Народная асвета, 1995. – 32 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. Дзіцячы фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / Рэд. У.А. Васілевіч і інш. - Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.
24. Зборнік гульнёва-забаўляльных праграм для арганізатараў вольнага часу “Весяліцца – не журыцца” / Уклад. К.Л. Лабчэўская. – Мінск: 1998. С.3- 86
25. Зборнік гульнёвых праграм “У гасцях у гаспадыні прыроды” / Уклад.: П.А. Гуд, К.М. Пятровіч. – Мінск, 2000. – С3-39.
26. Зборнік сцэнарыяў культурна-відовішчных праграм “На крылах творчасці” / Уклад. П.А. Гуд – Мінск: ТДА “Ларанж-2”, 2001. – С.3- 68.
27. Игры народов мира / Сост. Е. Пальгина. - Москва: Терра - Кн. клуб, 2002. – 305 с.
28. Каминский А.Я. Методика подготовки и проведения игровой программы / А.Я. Каминский // Методическое пособие № 22 ГКДУ “ЦДО” ВС РБ. – Мінск: 2001. – С.. 23-30.
29. Каминский А.Я. Сценарная разработка детской игровой программы / А.Я. Каминский // Методическое пособие № 21 ГКДУ “ЦДО” ВС РБ. – Минск: 2001. – С. 45-50.
30. Котаў, М. Народныя гульні / М. Котаў – Мінск, 2004. – 36 с.
31. Котаў, М.К. Народныя гульні, карагоды, танцы / М.К. Котаў. - Мінск: Светач. 2006. – 69 с.
32. Краж, У.М. Беларускія народныя гульні ў школе: Вучэбна-метадычны дапаможнік / У.М. Краж. – Мінск: Выд. А. Ванін. 1992. – 111 с.
33. Кухаронак Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак - Мн.: Ураджай, 2001. – 238 с.
34. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. - Мінск: Беларусь, 1997. – 176 с.
35. Лозка, А.Ю. Беларускі народны каляндар / А.Ю. Лозка. - Мінск: Полымя, 2002. – 237с.
36. Народны тэатр / Уклад. М.А.Каладзінскі – Мінск: Навука і тэхніка, 2003. – С. 25-134.
37. Подвижные игры в детском саду: Пособие для педагогов дошк. учреждений / Т.Г Лихадиевская, И.М. Ивановская. – Мінск: Беларусь, 2002. – 240 с.
38. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы / І.І. Сучкоў. - Мінск: НІА, 2001. – 176 с.
39. Сысоў, У.М. 3 крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. - Мінск: Вышэйшая школа. 1997. – 415 с.
40. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш–Мінск: Бел. навука, 2001. – Т.1. – С.10-111.
41. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш. – Мінск: Бел.навука, 2004. – Т.2. – С.10-98.
42. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. - Мінск: ВелСЭ, 1989. - 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ